

ШЛЯХ АД СЭРЦА ДА СЭРЦА

6

АСТРАВЕЦ – ГОРАД МАЛАДЫХ



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на родная мове

# ЗВЯЗДА

3 КРАСАВІКА 2024 г.
СЕРАДА
№ 66 (30200)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

## КОРАТКА

- **Экспертны савет падтрымаў праект дакумента аб Беларускім добраахвотным пажарным таварыстве.**
- У Гродне адкрыўся Расійскі цэнтр навукі і культуры.
- **Чытачы Нацыянальнай бібліятэкі атрымаюць доступ да рэсурсаў Прэзідэнцкай бібліятэкі імя Б. М. Ельцына.**
- Пасольства Балгарыі ў Беларусі пачне прыём дакументаў на шэнгенскія візы на два тыдні пазней, чым запланавана. Раней балгарскае пасольства анансавала пачатак выдачы шэнгенскіх віз з 1 красавіка.
- **У Беларусі аўтаперавозчыкам дазволілі разлічвацца наяўнай валютай з нерэзідэнтамі.**
- Мінпрамы Беларусі і Расіі зацвердзілі 25 пашпартоў інвестпраектаў за сродкі расійскага дзяржкрэдыту.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «КЛОПАТ АБ ДЗЕЦЯХ, УНУКАХ, УСІХ, ХТО ПРАЦЯГНЕ НАШ РОД, — СУТНАСЦЬ СЁННЯШНЯГА МОМАНТУ»

## Якія перспектывы адкрывае камандзіроўка Прэзідэнта ў Гродна

**З памяццю аб мінулым, клопаце аб сучасным і з надзеяй на будучыню прайшла рабочая паездка Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Гродна. Праграма гэтай камандзіроўкі атрымалася насычанай і разнапланавай, але з адным пасылам — клопату аб дабрабыце жыхароў горада і рэгіёна.**

СТАР. 2–3




Фота БелТА.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Наталля ТАРАСЕНКА, дэпутат Палаты прадстаўнікоў:**

*«З увядзеннем Закона «Аб адказным абыходжанні з жывёламі» ў дзяржаве з'явіцца прававая база, якая будзе рэгуляваць усе адносіны ў сферы абыходжання з жывёламі. Лічу, што гэты закон важны для выхавання нашага грамадства ў духу гуманнасці, маральнасці, менавіта ў адносінах да тых жывых істот, якія ад нас залежаць. Бо яны таксама адчуваюць, таксама перажываюць эмоцыі, адчуваюць боль. Гэты закон накіраваны на гуманізацыю ў цэлым нашага грамадства».*

ISSN 1990 — 763X

Сумесны праект «Звязды» і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях
ЖЫВІЦЕ ЎБЯСПЕЦЫ

# Другі шанц

## Чаму варта ўстанавіць аўтаномныя пажарныя апавяшчальнікі?

**Аўтаномныя пажарныя апавяшчальнікі паступова становяцца дэвайсам, запатрабаваным у жылым фондзе. Устанавіць гэтыя ўстройствы, якія дазваляюць своечасова выявіць узгаранне і не праспаць уласнае жыццё, імкнуцца жыхары і прыватных домаўладанняў, і гарадскіх кватэр. Людзі ведаюць: спраўляцца з надзвычайнай сітуацыяй лепш на раннім этапе, чым потым ліквідоўваць яе наступствы. А яны могуць быць самыя сумныя.**

СТАР. 4



Актуальна

# ТОЛЬКІ НАЙЛЕПШЫЯ З НАЙЛЕПШЫХ

## Якой прадукцыі будзе прысвойвацца Дзяржаўны знак якасці

**Указ «Аб Дзяржаўным знаку якасці» быў падпісаны 18 студзеня 2024 года. З мэтай развіцця гэтага дакумента 29 сакавіка 2024 года падпісана пастанова ўрада аб парадку прысваення знака якасці. Пра тое, якая прадукцыя зможа яго атрымаць і што для гэтага павінен зрабіць вытворца, распавялі прадстаўнікі Дзяржстандарта.**

### ПЯЦЬ КРЫТЭРЫЯЎ

— Знак якасці прысвойваецца харчовым таварам, прамысловым таварам для насельніцтва, прадукцыі вытворчатэхнічнага прызначэння, выробленай юрыдычнымі асобамі Рэспублікі Беларусь, у адпаведнасці з крытэрыямі, указанымі пры апісанні знака якасці. Гэта бяспека, экалагічнасць, інавацыйнасць, тэхналагічнасць і эстэтычнасць, — падкрэсліла **першы намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Рэспублікі Беларусь Алена МАРГУНОВА**.

Візуальная форма — пяцівугольнік, дзе кожны з бакоў сімвалізуе адзін з гэтых крытэрыяў, дадала яна.

СТАР. 5